№ 78 Ausgabe B.

ГОМАН

Цана з перасылкай і дастаукай да хаты:

на 1 год—10 м. 80 фэн., на ½ году—5 м. 40 ф., на 3 месяцы—2 м. 70 ф., на 1 мес.—90 фэн.

Беларуская Віленская часопісь
выходзіць два разы у тыдзень: у аўторкі і пятніцы.

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Віленская 33.
Адрэс адміністрацыі і экспэдыцыі: М. Стэфанская 23.

Цана абвестак:
на 4-ай старане за радок дробнымі літарамі — 25 фэніг.; дробныя абвесткі— па 5 фэн за слова. Абвесткі аб сьмерці — 60 фэн. за лінейку дробн. друкам.

№ 78 (274). Год III. Вільня, 4 кастрычніка 1918 г. Цана 10 фэн. (5 кап.)

ТЭЛЕГРАМЫ.

3 кастрычніка.

Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: з генэрал-ан-шэфа ф. Бэн'а: У Фляндрыі непрыяпельскія атакі на поўнач ад Стадэн і на паўночны заход ад Розэляр адкінуты. Мы ўзялі тутака каля 200 палонных. Таксама адкінута часьцёвае наступленьне вечарам з абодвух бакоў дарогі Іпр Мэнэн. Армант'ер і Ленс у ночы з 1-го на 2-е пакінуты бяз бітвы. Мы занялі пазыцыі на ўсход ад гэтых двух местаў. Вораг днём абстрэліваў артылерыяй пакінутыя пазыцыі. Перад Камбрэ спакойны дзень. Часьцёвыя атакі ворага з даліны Шэльды пры Руміійі адкінуты. Сільныя атакі проці нашых новых ліній на поўнач і ня поўдзень ад Сэнкантэя адбіты.

Фронт нямецкага Насьледніка: На паўдзённы ўсход ад Анісі-ла-Шато і на поўнач ад Філен мы адбілі часьпёвае наступленьне ворага. У Шампані вораг з вялікімі сіламі прадаўжаў свае атакі на ўсход ад Свіпп проціў Сент Марі а Пі а таксама паміж Сомпю і Монтуа. Мяйсцовыя нязначныя удачы контракамі выраўняліся. На іншым фронце атакі зламаліся перад нашымі лініямі. Гэтак сама не ўдалося наступленьне ворага з абодвух бакоў ад Энь і ў Аргонах.

ВЕНА. 2.X. (В.Т.Б.). „Fremdenblatt“ лічыць магчымым, што Малінов дастане згоду собранія, але цэнтральныя дзяржавы лічыліся з гэтаю магчымасьцю. Яны глядзяць на пасьледзтвы баўгарскіх выпадкаў спакойна і будуць умець утрымаць свае мейсца на блізкім усходзе.

ВЕНА. 2 X. (Ц.Б.). Аб новым ваенным прадпрыняцьці саюзьнікаў на Балканах яшчэ нічога ня ведама. Зробленае, можа быць, замірэньне, ведама ня мае значэньня для нямецкіх і аўстрыяцкіх войск, і опэрацыі ў Албаніі таксама не закончаппа, урэсьці як мацэдонскі, так і албанскі тэатры толькі другарадныя. Адпалька-ж Аўстрыя ніяк не дапусьціць узмацненьня Італі і наўсходнім беразе Адры.

ШТОКГОЛЬМ. 2.X. (В.Т.Б.). Орган младасоцыялістаў „Folkersštatsbladet“ прыдае развіцьцю ўнутраняй палітыкі Нямеччыны большае значэньне, як мовам Вільсона і капіталістычна - ваеннай машынэры, пры помачы якой Вільсон хоча дайсьці да доўгага міру.

БЭРЛІН. 3.X. На вернападанную тэлеграму саюзу землярobаў провінцыі Шлезвіг-Гольштэйн Імператар адказаў між іншым: «Я цьвёрда веру ўпраўнае закончаньне вялікае вайны у захаваньне Нямеччыны і яе шчасьлівую будучыну.

БУКАРЭШТ. 1.X (В.Т.Б) „Lamina“ кажа аб магчымасьці што выпадкі ў Баўгарыі астаюцца бяз далейшага пасьледства. Румынская грамадзянская думка ня выйдзе з свае спакойнасьці. Два апошніх гады далі даволі навукі, каб уцячы ад магчымых авантураў.

РОТТЭРДАМ. 2.X. Афіцыяльныя зьвесткі саюзнай глаўнай каманды даносяць аб заўзятым спраціўленьні аўстрыякаў на поўнач ад возера Охрыда.

БЭРЛІН 3.X. З апошніх вес так з Швэцыі няшчасьпе на чыгунцы на участку Мальмэ-Штокгольм прадстаўляе страшную катастрофу. Баяцца, што з 1000 пасажыраў зьгінула 300.

ВЕНА. 2X. (В.Т.Б.). Міністар Гусарэк у парлямэнце крытыкуе бязмерныя выказы аднаго чэха проціў Нямеччыны: «Нямеччына і яе галава стаяць вышэй ад такіх абід, але мой абавязак, як начальніка ураду, пратэставаць проціў такіх выпадаў шовінізму“. Чэскі соцыяліст адказаў тады: „Чэхі заінтэрэсаваны у тым, каб аставацца у добрых адносінах з суседнім нямецкім народам, які заўсёды астанецца вялікім народам“.

ХРЫСТЫЯНІЯ 2.X. (В.Т.Б). Быўшы лёндынскі пасол савецкага ураду, Літвінаў, прыехаў сюды з 46 рускімі у абмен на арэштаваных у Расеі англіцкіх чыноўнікаў. Прадстаўнік большэвікоў у Хрыстыяніі Бэйдлер, які знаходзіцца паміж выменeннымі сказаў аднаму газэтнаму коррэспондэнту, што саюзьнікі хочаць скінуць рэвалюцыю і узьдзьвігнуць манархію, каб уратаваць такім спосабам уложаныя у Расею грошы.

ГААГА. 2.X. Новы прэзыдэнт Кітая сказаў коррэспондэту газэты „Тан“, што будзе прытрымлівацца палітыкі згоды паміж поўначчу і поўднем каб дайсці такім спосабам да ўгоды.

БЭРЛІН. 3.X. Амстэрдамскі орган актывістаў піша аб бельгійскім пытаньні: «Пры заключэньні міру водлуг англіцкага густу бэльгійская незалежнасьць будзе толькі на паперы. Па праўдзе кароль у нас будзе мець ня больш правоў за прафэкта францускага дэпартаменту ці губэрнатара англіцкай колёніі.

ГААГА. 2.X. Камбрэ, якое яшчэ зусім нядаўна было непашкоджана з весткаў газэты «Tajms» абнята полымем.

БЭРЛІН. 3.X. У гандлёвую кнігу мэмэльскага суда ўпісана акцыянэрнае таварыства чыгункі Мэмэль-Шаўлі, якое знаходзіцца ў Мэмлі. Мэта прадпрыняцьця падгатоўка і выпаўненьне праекту чыгункі Мэмэль-Шаўлі. Закладчыкі таварыства: магістрат места Мэмэля, павятовы саюз Мэмэля і сельскі павет Мэмэль а так сама і іншыя юрыдычныя асобы.

Вільня, 4 кастрычніка 1918.

Вайна уздрыганула усім сьветам. Сярод гэтае буры разбудзіўся і беларускі нар. Разбудзіўся на тое, каб выказаць сваю волю да нацыянальнага жыцьця, каб будаваць самому сваю будучыну.

Першыя арганізаваныя праявы нацыянальнае волі беларускага народу бачым з таго боку крывавай мяжы, якая разрэзала нашую бацькаўшчыну на дзьве старонкі, што адна аб другой нічога ня ведалі і не маглі сабе ні ў чым памагчы. Ня глядзячы на гэта, як толькі рэвалюцыя скінула ланцугі з народаў, што былі прыдушаны і стагналі пад ярмом Расеі, заварушыліся і беларусы.

Спачатку узяліся за працу толькі тыя, у кім нацыяльная сьведамасьць ужо была разбуджана. Гэта былі беларускія інтэлігэнты — людзі з навукаю, што не адракліся ад свайго народу. Гэтая інтэлігэнцыя, узяўшыся за работу, выдае газэты, кніжкі і вядзе арганізацыйную працу — творыць гурткі і саюзы, заклікае беларускія з'езды. Але аднае, і то вельмі нялічнае інтэлігэнцыі было мала на тое, каб паставіць беларускую справу, адраджэньне усяго народу, на моцны і поўны грунт. Трэба было, каб сам народ, шырокія яго масы самыя загаварылі і падалі свой важкі голас у гэтым пытаньні.

Вось за гэты народны голас прышлося вытрымаць беларусам цяжкую і няроўную барацьбу. Па старане ворагаў беларускага народу, што аб яго правох да незалежнага жыцьця і чуць не хацелі, была уся сіла расейскай дзержаўнасьці і лічная інтэлігенцыя. Апрача таго ўспомнім што на беларускай зямлі стаялі міліёны расейскага войска, усялякія гарадзкія і іншыя саюзы, дзе працавала (калі можна так казаць) цэлая маса маскоўскай прышлай інтэлігэнцыі. Адным словам усё жыцьцё на Беларусі было у руках чужынцаў. А гэтыя чужынцы, кінуўшы свае простыя абавязкі, разьвялі найгоршае палітыканства і самую нягодную дэмагогію, проста кажучы, брахню. Перш за усё гэтая брахня была скіравана проціў беларусаў. Яны баяліся, што беларусы, узяўшы сілу, або прагоняць іх заўсім, або прымусяць навучыцца пабеларуску і займацца працай, а не малоць языком.

А польская інтэлігэнцыя? Яна была толькі моцна аглушана рэвалюцыяй але ня траціла свае сілы і, трэба аддаць ей справядлівасьць, займалася спакойна сваей звычайнай работай: начапляла дзе трэба і дзе ня трэба „orzełki“ і апалячывала беларусаў-каталікоў.

У такіх цяжкіх абставінах што магла зрабіць жменка сьвядомых беларусаў? Але беларусы былі сільныя сваей вераю у тое, што іх справа жывая і вялікая і што прыйдзе час і народ сам пераложа ўвесь цяжар на свае моцныя плечы. Беларусы не памыліся, бо пасьля некалькі месяцаў цяжкага змаганьня прышла помач ад беларускага салдата. Беларус стойка стаяў на фронце і не ўвайходзячы у тое, хто вінен а хто не, меў адну думку — ня ўпусьціць вайны у сваю старонку. Калі-ж ён убачыў, што маскаль усё кідае, робіць бунты ідзець паліць і рабаваць — ён пачаў думаць што ўсім сваім людзём, усім беларусам трэба злучыцца у вадно, каб бараніць сваю старонку ад вайны, пажару, рабунку і безладзьдзя. Добры прыклад украінцаў таксама меў вялікае значэньне.

Вось як раз у гэтым часе прошлага року з усіх бакоў фронту пашлі весткі, што беларусы салдаты усюды дамагаюцца пазваленьня зрабіць свае зьезды. Адзін за другім адбыліся зьезды усіх фронтаў — у Менску, Віцябску і Кіеве. Усе пастановы згодна жадалі аўтаноміі і Беларусі беларускага войска, беларускай мовы у навучаньні. Але на беларускае войска большавікі ня згодзіліся. Яны добра разумелі, што беларусы ня пойдуць разам з імі паліць і рабаваць, яны баяліся за сваё панаваньне на Беларусі

Тады беларусы пачалі тварыць войска без усякага пазваленьня. А палітычная праца йшла сваім парадкам. Споўняльныя Камітэты фронтавых зьездаў выбіраюць Цэнтральную Беларускую Раду. Рада склікае Вялікі Агульны Беларускі Зьезд з прадстаўнікаў ад усіх валасьцей, мястэчак, местаў, земстваў і розных культурных і экономічных організацый. Гэта было першае праўдзівае народнае прадстаўніцтва Беларусі. Зьезд агаласіў Беларускую Народную Рэспубліку. Мы ведаем — большавікі на радасьць усіх нашых ворагаў разагналі зьезд з аружжам у руках. Беларусам не ўдалося узяць уладу над сваім краем у свае рукі. Але уся работа, зьезды, пастановы дарма не прапалі і не прападуць. Аб усім гэтым ужо ніяк нельга сказаць, што гэта работа жменкі інтэлігэнтаў, бо тутака была праўдзівая воля народу, праўдзівае прадстаўніцтва.

Вы, што ня верыце у сілу беларускае ідэі і ў магчымасьць нацыянальнага адраджэньня Беларусі, уважна прыглёдзьцеся да гэтае справы, прыслухайцеся да голасу усяе Беларусі а не да якога колячы збаламучанага нягоднай брахнёй цёмнага кутка. Уся Беларусь сказала, што яна жыве і будзе жыць! Імя Беларусі разышлося ужо па усей старонцы і «тутэйшы» пачынае сябе называць — беларусам. Ведама, аднаго імя беларуса мала на тое, каб збудаваць

сваю бацькаўшчыну. На гэта трэба працы і людзей.

Умейма глядзець праўдзе у вочы: у нас усяго гэтага мала. Народ хоць ужо і разбудзіўся, але йшчэ дрэме, праціраe вочы і ня мае яснай думкі ў галаве, за што узяцца, што рабіць, куды і з кім ісьці. А ворагі кругом абступілі, хочаць ізноў напаіць яго сонным зельлем, каб ён заснуў ўжо вечным сном: тады яны абдзяруць яго да апошняе ніткі і растопчуць пад сваімі нагамі — ня будзе сьвет і ведаць, што былі такія беларусы. Усё гэта сьвятая праўда. Але хай нас гэта ня пужае а нашых ворагаў ня радуе. Народ хоць і дрэме, хоць мясцамі й зусім спіць яшчэ, але што раз то балей знаходзіцца сьвядомых яго сыноў, што самыя сьвету ўбачыўшы будзяць і другіх, паказваючы скуль яснасьць адраджэньня, дзе праўда і шчасьце народу. Могуць адбіваць ад нас асобных людзей, могуць кускамі рваць нашую зямлю, але кожны раз, як толькі цэлы народ зьбярэцца, ён назаве сябе беларускім народам. Толькі пакуль народ сьпіць — панаваньне чужынцаў. Але як збудзіцца—ён адрачэцца ад чужога і назаве сябе беларусам. Гэта будзе навет у тых разох, калі разбудзіць яго вораг, хочучы навязаць яму свае думкі і сваю сьведамасьць. Карысьці ад гэтага будзе мала, бо беларус раней ці пазьней скіне чужую скуру, бо-ж ён беларус, бо яму так сама прырода кажа. Мы ужо бачылі на беларускіх зьездах, што не памагала ніякае баламуцтва, ніякая брахня. Мала што шмат перакінчыкаў, шмат каму галава дурам закручана. Прыйдзе час і усё гета пяройдзе. Гляньце: гэта ж мы йдзём уперад. мы расьцём і разьвіваемся. Хоць у нас усяго яшчэ мала, але недаверкі і ворагі не спадзяваліся ніколі, каб мы й гэта мець маглі. Дык адкіньма-ж недаверства, беларусы, і ведайма, што мы усё мець можам і ўсё мець будзем, што патрэбна да жыцьця народу, абы толькі мы самыя захацелі. Кіньма лічыць ворагаў і ўсе перашкоды, а, хто толькі жыў, біймa у білы усіх званоў, каб разбудзіць увесь народ на тую гадзіну, калі прыйдзе жаданы мамэнт усесьветнага міру. Не забывамася што мір уздрыгане ўсім сьветам ня менш за вайну. Будзьма на старожы!

Падвойная справядлівасьць.

Адзін місіянар, што доўга працаваў сярод дзікага народу, каб асьвяціць яго ў веры хрысьціянскай, запытаўся раз аднаго з новонаварочаных, як ён разумее дабро і зло. „Зло—гэта будзе, на прыклад, тады—адказуе той—калі хто украдзе ў мяне жонку“. „Добра, добра“, кажа місіянар і пытаецца: „А каліж будзе дабро?“ „Дабро будзе, калі я сам украду ад яго жонку“. Вось гэта і называецца падвойная справядлівасьць.

Мы будзем сьмяяцца з дзікага чалавека, але забываемся аб тым, што й паміж людзьмі культурнымі і сьветлымі такое зразумленьне справядлівасьці здараецца дужа часта. Ані ня лепш за нашага дзікага разумеюць справядлівасьць паны з „Дзеньніка Польскага“, што выходзіць у Чэнстахове.

Тым часам цяпер, калі палякі могуць мець толькі йшчэ адну надзею на тое, што ім можа усьміхнуцца гістарычнае шчасьце, ужо пачынаюць выглядаць што, дзе і ад каго можна забраць, можа дзе што нядобра палажана і ня моцна ўмацована. Харошы зваротак, прыгожыя манеры!

Але ня досьць таго, што хочуць забраць чужое — яны, як раз як той дзікі, кажуць, што гэта й добра, што гэтак і павінна быць.

Калі хто ўжо гневаецца ці яшчэ ня верыць, каб гэта была праўда, раджу паслухаць далей або найлепш прачытаць самому 263 і 266 намяры гэтага „Дзеньніка Польскага“.

У 266 номяры прыводзіцца зьмест рэфэрату нейкага пана Марчэўскага, што ён выказаў на сходзе ў справах усходных межаў Каралеўства Польскага. На самым пачатку пан Марчэўскі кажа, што аб Віленшчыне няма чаго і гутарку вясьці, бо Віленшчыну ён называе цэнтрам польскай зямлі (вось чаго мы дачакаліся—няма ведама, як гэта й зразумець). Ен гаворыць толькі аб Віцябшчыне і аб «Польскіх» Інфлянтах. Вось жа ён тамака сам сёлета ў летку быў і... добра нагледзіў дзе што ляжыць. Пан Марчэўскі хваліцца, што ён добра прыглядаўся, хадзіў навет каля вазоў па рынку, быццам прыслухацца, ці гавораць папольску і даведацца, ці штат там палякоў. Бог яго ведае. чаго ён там хадзіў па рынку, ды толькі сам ён прызнаецца, што палякоў там «меншасьць» (разумей: зусім мала) а гавораць па польску дужа кепска (о, мы добра ведаем, як там гавораць «popolskiemu»).

Аж дзіва—пан Марчэўскі паказвае часамі дужа вялікую сумленнасьць. Ен прызнае, што там ёсьць беларусы—каталікі і не залічае іх да палякоў. Яго ня пужае навет, што пры такім рахунку палякоў выходзіць дужа мала. Але гэта нічога, даводзіць гэты самы спрытны пан, што палякоў там мала, зато зямлі ў іх шмат: »Ў Лепельскім павеце маёнткаў польскіх большых за 100 дзесяцін ёсьць 261, а ўласнасьць польская становіць 72% усяе ўласнасьці».

Дык што-ж з таго што палякоў там мала а зямлі ў іх шмат? Ці не падзяліцца ім з беларусамі, бо ў іх зямлі мала а самых шмат. А барані, Божа!

Вось паслухайце толькі якую ён разумную а яшчэ больш справядлівую дае раду: «Нашыя абмежкі*) кажа ён, разьвязуюць зямельнае пытаньне ў нас, бо як раз там можа памясьціцца ня толькі 3 міліёны нашых беззямельных або малазямельных сялян, але два або й тры разы толькі». Усе гэта на тое, каб уратаваць польскасьць, каб ратаваць культуру, усё добрае, сьвятое—бо ведама-ж толькі паляк добры, разумны, маральны а мо'і сьвяты.

Гэтак польскія паны на Беларусі перададуць землі палякам з Каралеўства а беларускаму селяніну ужо зямлі на сваёй бацькаўшчыне ніяк набыць не дастанецца — хіба сажань пяску на магілках. А калі гэтага ня хочаш, то зьбірай свае лахманы, разьвітайся на заўсёды з родным краем і йдзі сабе ўпрочкі: або на зямлю ў сібірскія лясы, або куды у адработнікі.

Каб гэтак зрабілася (барані Божа), як радзіць пан Марчэўскі, то было-б прынамсі ведама, куды беларус мае йсьці за парабка. Ня йнакш, як да тых самых палякоў у Польшчу. Бо, калі з Каралеўства Польскага перасяліць сюды і ня 10 міліёнаў людзей, як праектуе пан Марчэўскі, а толькі якіх 5—6, то ў Польшчы астануцца адныя паны і ня будзе каму рабіць, за тое што там жывець 12 міліёнаў палякоў разам з гарадамі і мястэчкамі. Гэтакім парадкам пан Марчэўскі хоча зрабіць, відаць, усіх палякоў панамі, а беларусаў іх парабкамі. Але што на гэта скажуць беларусы. Што скажуць — пакажа будучына, але маўчаць ня будуць.

Мне здаецца што ня толькі беларусы ня будуць маўчаць, але ня будуць маўчаць і некаторыя з тутэйшых палякаў, хто разумее, што зямля перш-на-перш належыць да усяго краю, а пасьля да яго, што прадаваць чужынцам зямлю тады, калі зямля патрэбна таму, хто на ей вякамі працаваў, ліў свой пот і кроў, называецца здрадай краю. Мы разумеем, што такой радай самыя польскія сяляне будуць ня вельмі рады: ім трэба кідаць сваю бацькаўшчыну, ехаць на чужое і вясьці барацьбу з тымі, да каго па справядлівасьці павінна была-б належыць зямля. Паном Марчэўскім можна сказаць так: калі ужо так хочаце запраўды ашчасьлівіць польскіх сялян, то падзялецеся з імі зямлёй у Польшчы, бо і там дужа шмат вялікіх земляўласьнікаў, а зямля уроблена добра і да таго сялянам ня трэба будзе выежджаць на чужыну. Зрабеце гэтак і будзем тады жыць у згодзе. А калі захочаце перасяліць сваіх сялян да нас а нас пасланць з торбамі упрочкі, будзем ваяваць. Ведайце, што беларускі народ не дасца. Лепш бараніце свайго і ня сьцігуйце на чужое.

Можна было-б думаць, што гэтакія пляны зарадзіліся у галаве толькі аднаго пана Марчэўскага і спакойна з іх сьмяяцца. Але з розных вестак, чуваць, што сярод польскіх нацыяналістаў гэтая думка разьбіраецца зусім паважна і каб толькі маглі, то яны зараз-жа пачалі-б уводзіць яе у жыцьцё. Гэтак паднялася-б калатніна і грызьня паміж братнімі народамі. Карысьці з гэтага было-б мала а бяды шмат. Скарыстаў бы хто іншы. Беларусы могуць толькі шчыра жадаць, каб палякі зразумелі, да чаго можа прывясьці такая колёнізацыя і каб як найхутчэй паміж імі зьявіліся людзі, што павялі-б агітацыю процiў такіх нягодных плянаў.

Пан Марчэўскі рэжа праўду ў вочы і перакручуе мала. Хоць гэта добра: адразу бачыш з кім маеш дзела. Але звычайна спачат-

*) Абмежкамі („крэсы“) значыць землямі каля мяжы, прыгранічнымі, палякі і дагэтуль называюць свaх суседаў быццам, тыя й ня могуць быць самыя па сабе, а ўсё толькі іхнымі абмежкамі: ласыя касіць чужыя сенажаці!

БЕЛАРУСКІЯ ПРЫПЕЎКІ.

Розныя прыпеўкі.

Каб я сваю жонку меў-бы,
Ані піў-бы, ані еў-бы;
Ані еў-бы, ані спаў-бы,
Толькі жонку цалаваў-бы!

*

Каля мяне хлопцы ўюцца
І за мяне хлопцы б'юцца,
А я люблю аднаго —
Вам ня ведаці каго.

*

Скачы, скачы, кульгавы,
Ад прыпечку да лавы,
А ад лавы да сяней
Кульгаваму весялей.

*

Дарожачка летам запала,
Дзяўчыніца перавоз крычала.
„На што табе, дзяўчыніца перавоз?
Я-жбы цябе на ручках перанёс“.

*

Кавалер, кавалер, маё сердзечка!
Ты ня сей канапель ані зернята:
Канапелькі брацць,—мае ручкі баляць,
Каля лёну хадзіць, маё сэрца баліць,
А гарэлачку піць, маё сэрца кіпіць.

*

Бульбу пякуць, бульбу вараць,
Бульбу ядуць, бульбу хваляць:
З бульбы мука, з бульбы каша;
Прападзі ты радня наша!
Адзін лапаць, другі бот;
А я шляхціц, далі Бог!
Ай муры растатуры
Я шляхоцкай натуры:
Што субота, то бліны.
Што нядзеля — пірагі.

*

Як мяне бацька гадаваў;
Хлеба солі не даваў,
Каб вяліка не расла,
Скора замуж не пашла.
А я замуж хацела,
Кулем з печы зьляцела.
Пакуль з печы звалілася,
Пра замужжа забылася.

*

Антонька маладзенькі,
Насовенька кароценькі,
А трасецца калоціцца,
А чаго-ж табе хочацца?
„Ці рэпкі салодзенькай
„Ці дзеўкі малодзенькай?“
— А я рэпку кусаць буду.
— Красну дзеўку цалаваць буду,
— Красну дзеўку любіць буду.

*

Сівы конь, сівы конь
А белая грыва,
Любіць буду кавалераў,
Пакуль буду жыва.
Сівы конь, сівы конь
Белыя галёнкі,
Ня едзь, ня едзь мой міленькі,
Да чужое жонкі,
Бо чужая жонка
Як асінка горка,
А я-ж маладзенька,
Як мёд саладзенька.

*

Шэры бор, шэры бор,
Тры гарошынкі,
А хто мяне пацалуе,
Той харошанькі.

*

На гародзе лебяда.
Вышэй гарадзішча,
Няма дзевак на вуліцы,—
Ня будзе ігрышча.
Я тую лебяду,
Казамі патраўлю,
Дзевачак сабяру,
Ігрышча спраўлю.

*

Вох туры, лататуры,
Я салдацкая натура!
Я-й да конікау канюх,
Я-й да волікаў пастух,
Я-й да зайчыкаў стралец,
Я-й да дзевак маладзец.

*

Кукарэку пеўнік,
Да на гары хатка,
Харошая дзяўчыніца,
Да ліхая матка.

*

Ня буду я гарод гарадзіць,
Ня буду я і капусты садзіць;
Лепей буду я ў сьнітку хадзіць;
А ў сьнітцы нагукаюся —
З казакамі нагуляюся!

*

Ой паскачу, паскачу —
За паповіча хачу: —
А паповіч панічок
Да купіў мне касьнічок!

*

На вуліцы дым, дым да мяцеліца,
Дзе-ж, маё сэрца, да падзенецца?
На вуліцы дым, дым да мароз будзе,
Дзе ж, маё сэрца, начаваць будзе?

*

Я-й касіла, я-й арала, —
За хлопцамі боса драла;
Я-й гарэлку піла,
Хлопцам трасцу дала. —
Ой калі я да Лявона любіла,
Дык тады я чаравікі насіла,
Перастала я Лявона любіць,
Перастала й чаравікі насіць.

*

Чаго ідзеш па вуліцы?
Чаго цягнешся?
Чаму мяне не бярэш?
Чаму-ж дражнішся?
Ці кашуля чорна?
Ці я не пазорна?
Кашулечка бела, —
Бяры-ж мяне сьмела.

*

Гуляй, гуляй, мая жоначка,
Гуляй, гуляй, самаволачка
Хоць ты ўсю ночку гуляй,
Толькі мяне маладога ня кідай.

ку вывярнуць праўду на другі бок і тады толькі кажуць, што трэба. А трэба найчасьцей забраць нешта чужое.

Вось у 263 номеры тае самае газэты піша някі пан «Doktor M. Nałęcz Dobrowolski». Ен даводзіць, што край паміж Вяльлёй, Нема-нам і Беразінай «rdzennie polski» (зусім польскі). А жывуць тут не апалячаныя беларусы а самыя праўдзівыя, чыстыя мазуры, куявякі і іншыя «koroniaż ». Яны быцам і гавораць інакш і выглядаюцн інакш ад беларусаў.

Чысты сьмех! Відаць, пан Добровольскі зусім тутака ня быў і ня ведае таго, аб чым піша. А калі ведае, то адумысля брэша, як наняты. Бо пакажэце-ж, ці відзеў хто тут такіх «мазураў», ды яшчэ каб іх набралася да 3 мільёнаў, як цьвердзіць пан Добровольскі. Гетых мазураў навялі быццам сюды беларускія і літоўскія князі, набраўшы іх у часе вайны ў палон. Праўда, што гэта было. Але гэта было больш за паўтысячы гадоў да гэтага, а цяпер ужо ўсё так пераманілася, што й знаку ніякага няма, а ім прыйшло ў галаву шукаць каплю ў моры. Шукай, ня шукай—усё роўна нічога ня знайдзеш. То-ж і беларусаў хіба часамі ўдавалася браць палякоm у палон і вясьці ў сваю старонку, але мы й ня думаем шукаць таго, што назаўсёды прапала.

А цяпер праўдзівых „кароняжаў" палякоў з крыві і мовы ў нас дужа мала: мо й набіраецца якая тысяча. Больш маем такіх, што з паходжаньня тутэйшы чалавек, беларус, мо' часам літвін, але прызнае сябе сьвядома—палякоm, гаворыць па польску. Калі хоча, хай сабе будзе палякоm, абы ён быў верным сынам нашага краю, то да яго ніхто ніякай крыўды мець ня можа. Гэта найбольш паны, шляхтуны і меставыя людзі.

Сялянства скрозь гаворыць па беларуску. А калі яно часамі умее «po polskiemu» то ўжывае польскае ламаніны не ў сябе ў хаце, а ў касьцеле, у месьце, на рынку. Гэта ўсё тыя «тутэйшыя», што маюць «польскую веру» і «каталіцкую нацыянальнасьць». Але-ж, паны дабрадзеі, нельга-ж іх назваць палякамі. Яны ўжо пачынаюць называць сябе беларусамі, і ня пройдзе колькі гадоў, як ад мазураў пана Добровольскага нічога не застанецца.

Дык на што-ж Вам гэтыя стараньні, пане Добравольскі? На тое, каб ачмуціўшы несьвядомыя беларускія масы, вырваць найлепшы кусок з усяе Беларусі і прылучыць яго да Польшчы, а пасьля ўжо наслаць сюды праўдзівых мазураў. Мы ведаем, што польскія паны з Кракова і Варшавы ўжо гострацць зубы і нажы на нашую бацькаўшчыну, замест таго, каб тварыць справядлівыя ўмовы да спакойнага суседзкага жыцьця. Ужо ў мэморыі інформацыйнага бюро ў Кракаве да польскай Рады Стану яны назвалі Беларусь «Новай Польшчай».

Пакуль што ўсё гэта толькі словы, але вельмі хутка можа прыйсьці і да дзела. Дзеля гэтага беларусы павінны быць гатовы бараніць сваю бацькаўшчыну і ведаць, што адыная іх надзея ў самых сабе, бо калі самыя сабе не паможам, то і «найлепшы» прыяцель, можа забраць ад нас толькі найлепшае.

Б. Адамовіч.

У Вільні і ваколіцах.

× **Агульны сход Т-ва „Золак"** дзеля гадавой справаздачы адбудзецца ў нядзелю 6.X. у школьнай салі гэтага-ж Т-ва, Бэрнардынскі завулак № 7. Урад запрашае ўсіх членаў прыбыць на сход пунктуальна а 6-ай гадзіне вечара.

× **Сплата налогаў.** Штадтгаўптман апавяшчае, што 1 кастрычніка павінен быць выплачаны астатак налогаў, разложаных на 1918 рок. Хто яшчэ не заплаціў налогаў як за гэты, так і за прошлыя гады, павінны гэта зрабіць не пазьней за 20 кастрычніка — на Дамініканскай 3, пакой 3.

Вярнуўшыяся з Расеі ўласьнікі нярухомасьцей, што знаходзяцца ў гарадзкім павеце Вільні прызываюцца зараз жа заплаціць налогі за 1916, 1917 і 1918 гады.

× **Падціска на 9-ю пазыку.** Падпіску на 9-ю ваенную пазыку прымае ва ўсём нашым краі пачтовая кантора.

× **Новае расьпісаньне на чыгунках.** З першага кастрычніка тутака ўведзена новае расьпісаньне на чыгунцы. Аб зробленых пераменах можна даведацца на станцыях і ва ўсіх урадовых мяйсцох.

× **Цана на соль.** Штадтгаўптман паведамляе, што пачынаючы ад 1 кастрычніка фунт солі каштуе 40 фэнігаў.

× **Тэмпэратура.** Найвышэйшая і найніжэйшая тэмпэратура за апошнія дні была (па Цэльсію):

	найвыш	найніж.
30—1	+ 16,0°	+ 2,5°
1—2	+ 13,0°	+ 5,5°
2 3	+ 10,0°	+ 3,8°

З усяго Краю.

МАЦЕЙКІ. Біскуп Карэвіч адведзіў гэтымі днямі нашае места. Прымалі яго вельмі урачыста. Перад горадам яго сустрэлі 20 коньнікаў адзетых у чырвонае. Перад горадам была устроена трыумфальная брама з надпісам: „Няхай жыве вольная Літва". Пры самым уезьдзе ў горад была пастаўлена падобная-ж арка. Вуліцы прыбраныя зялёнымі гірляндамі. Біскуп у таварыстве 80 дзяўчат у нацыянальнай літоўскай опратцы прайшоў па вуліцах благаслаўляючы народ.

КАЦІНЫ. 12 летні сялянскі сын Віктар Адамскі 12 ліпня на начлезе у спорцы з сваімі таварышамі раніў кішанковым ножыкам 14-летняга Зыгмунта Зубрыцкаго, каторы ад сільнага выплыву крыві памёр. Белястоцкі акружны суд засудзіў 25 верасьня 12-летняга забойцу на 4 месяцы турмы.

ГРУДЗІ. (Шавельскага павету). Тутака у біцьве з разбойнікамі забіты браты студэнт Ліудас Енкус і упраўляючы маёнткам Пранас Енкус. Як грамадзкія дзеячы, яны мелі вялікую павагу сярод літоўскага народу. Пахараны былі вельмі урачыстыя з колькімі ксяндзамі.

ГРОДНЯ. На Сапёрнай вул. агент патайнай паліцыі рабіў обыск у рабочага Ашэнбэрга. Ашэнбэрг спраціўляўся, выняў кінжал і хацеў закалоць агэнта. Толькі з вялікім трудом удалося абезаружыць яго і адвясьці у турму. Там Ашэнбэрга знайшлі на другі дзень павесіўшыся.

ПОЛОЕВО. (Волков. пав). 15 верасьня пад вечар банда больш менш у 15 чалавек напала на пана Калінкевіча, забіла брата ўласьніка і шчэзнула схапіўы каля 10 тысяч марак. Колькі гадзін апасьля тая самая банда узьбілася на суседні маёнтак Рогочайце. Пры вышаўшай страляніне забіты адзін разбойнік, а кухарка Вэроніка Владыскова была цяжка ранена і пасьля памерла. Калі на гоман выстралаў пачалі зьбягацца суседзі банда разбойнікаў адступіла, абдзёршы да гола труп забітага таварыша.

БУХТА. (Віленскага пав.) У ночы з 21 на 22 ліпня гэтага году 20-летні Віктор Юргэлевіч сякерай забіў сваіх бацькоў і братоў 7-мі і 10 гадоў. Забойца упорна адказваўся ад віны. Але на яго апратцы нашлі крывавыя плямы Віктар доўга ўжо знаходзіўся у спрэчцы з бацькамі, каторыя не хацелі пазволіць яму жаніцца з беднай дзяўчынай. Ужо колькі разоў Віктар гразіўся да сваіх бацькоў з нажом і сякерай. Перад судом забойца быў спакойны і не паказваў знакаў жалю. Водлуг рады пракурора Віленскі акружны суд засудзіў Віктара Юргелевіча на сьмерць.

ПОНАРЛІЦА. (Гродзенскага павету) 17 верасьня тутака згарэла праваслаўная царква. Прычына пажару не вядома.

ГРОДНЯ. З прычыны вялікага наплыву бежанцаў з Расеі у нашых ваколіцах даецца знаць вялікі няхват кватэраў. Прыступілі да адбудаваньня спаленых вёсак. Урад аддае лес тым, хто хоча будавацца, па 70 працэн. рыначнай цаны. У надзвычайных разох даецца пазыка, без працэнтаў на адзін рок. Прось-бы трэба падаваць лістоўна Крэйзамту Гродня

БЕЛАСТОК. Тутака вядзецца заўзятая вайна паміж публікай і дранжкарамі. Паліцыя змушана у такіх разох умешывацца і найчасьцей разьвязуе справы на карысьць пасажыра. Дранжкар, папаўшыся першы раз, плаціць штраф, а за другім разам у яго адбіраецца пазваленьне на промысел.

ЛІДА. З гродзенскай турмы уцёк тутэйшы шавец Міхал Запасьнік 18 гадоў з Зарэчнай вул. 14. Яго шукае беластоцкі акружны суд.

АБУХОВА. З пашы тутака украдзены на днях 10 летні гнеды конь. Наогул кражы каней у тутэйшых ваколіцах за апошні час вельмі учасьціліся. У пана Тукаллы у Белых Блатарах укралі каня, зламаўшы замкі.

ЕНІШКІ. Тутака стварылася таварыства для закупкі і выкарыстаньня лёну. Яно мае капіталу на 23 тысячы марак.

КРАТЭНАВА. (Панев пав.) З учасьцем тутэйшага ксяндза арганізуецца тэатр. Сабралі на яго 10 тысяч марак. Тэатр робіцца у адным вялікім гумне.

КОУНА. 1-га кастрычніка тутака адкрыўся першы 6-ці месячны курс для падгатаваньня вучыцеляк. Прынята 65 дзяўчат.

ТАЦЕВА. (Сувальскага пав.) Ад няведамай прычыны пачаўся пажар у сялібе Анны Цішэўскай, ад якога згарэла да шчэнту гумно і усе будынкі з гаспадарскімі машынамі.

ВЕСТКІ З РАСЕІ.

КОПЭНГАГА. 2.X. На Троцкага ў Баянску зроблены напад Ен ранены ў плячо, але не смяротна.

МАСКВА. 29.IX. «Извѣстія» даюць да ведама: „З загаду сібірскага ўраду у Омску за апошні час застрэлена 4.000 работнікаў жанок і дзяцей". У работніцкіх колах вялікае неўздаволеньне. У сталіцы сібірскага ўраду ў Омску сабраліся князь Львоў, Аўксентьеў і другія відныя контррэвалюцыянэры.

З усяго сьвету.

БЭРЛІН. У сёньняшнім пасяджэньні камісіі Палаты Паноў прынята агульнае, простае і роўнае выбарнае права з дадатковым выбарным голасам для асоб старшых за 40 гадоў.

БЭРЛІН. 30.IX. Імператар зьвярнуўся да канцлера графа Гэртлінга з рэскрыптам у якім паміж іншым

Выпадкі у Баўгарыі.

ВЕНА. 29.IX. Кароль Фэрдынанд баўгарскі зьвярнуўся да імпэратара Караля з лістом, у якім ён выказуе сваю саюзную вернасьць. Верučы у помач цэнтральных дзяржаў, ён застаецца на сваім мейсцы. Аб мірных кроках свайго ураду ён ня ведаў.

Бышы глаўнакамандуючы баўгарскай арміі енэрал Савов выказаўся оптым стычна аб ваенным палажэньні баўгар.

АМСТЭРДАМ. 29.IX. (В.Т.Б.). Рэўтэр дае да ведама, што англіцкі адказ на боўгарскую просьбу аб замірэньні ужо ёсьць. Ваенныя опэрацыі ня могуць быць спынены. Калі Баўгарыя хоча зрабіць мір з саюзьнікамі то перш за усё павінен баўгарскі урад разарваць з Турціяй, Аўстрыяй і Нямеччынай і не дапусьціць слаць нямецкае войска.

ВЕНА. 30.IX. (В.Т.В.). Аўстрыяцкае войска заняло Софію. Настрой у Булгарыі зрабіўся больш спакойны. Будзе створана новае міністэрства, ў якім сядзе і колькі енаралаў. Мала надзеі, што большасьць парляманту выкажацца за мір.

ЛОНДОН. (Рэўтэр) Паміж Баўгарыяй і саюзьнікамі зроблена замірэньне.

ПАРЫЖ. 29.IX. (Гавас). Сёньня ў ночы зроблена замірэньне паміж боўгарскай дэлегацыяй і глаўнай кватэрай усходняй арміі. На усім фронце даны загад затрымаць ваенныя дзействы.

Увага В. Т. Б. Урад у Софіі ня ведае варункаў замірэньня.

ЛОНДОН. Даюць да ведама, што вымагаюць ад Боўгарыі гэтага: 1) разаружаньне і дэмобілізацыя баўгарскай арміі. 2) передача саюзьнікам чыгунак. 3) зварот усіх зямель, што Баўгарыя заняла у часе вайны 4) вольны праход саюзьнікам у Турцыю, Аўстрыю і Румынію.

СОФІЯ I.X. (В.Т.Б.) Міністар-прэзыдэнт Малінаў адчыніў надзвычайную сэсію парляманту троннай прамоваю караля, у якой між іншым кажацца: „Пасьля сьпелага абсуджаньня палажэньня мой урад пастанавіў зрабіць замірэньне з нашымі лічнымі праціўнікамі і можа предлажыць мір". Малінаў прасіў назначыць другі сход на пятніцу, што і было зроблена.

ЛОНДОН (Рэўтэр). Замірэньне адразу уходзіць у сілу і павінна пягнуцца да з канчаньня мірных умоваў. Саюзьнікі вымагаюць, каб баўгары адразу ачысьцілі занятыя часьці Грэціі і Сэрбіі, каб баўгарскае войска было дэмобілізована, каб былі перададзены перавозныя спосабкі і аружжа. Саюзьнікі займуць усе пункты, маючыя стратэгічнае значэньне. Баўгарыя будзе занята англіцкімі, францускімі і італьянскімі войскамі, а грэцкія землі будуць заняты сэрбскім войскам. Разьвязка тэрыторыяльных пытаньняў адкладаецца да ўсесьветнага міру.

ВЕНА. Пасьля заняцьця сэрбамі Ускюба рух ворага затрыманы. Рухнуўшыя проціў Софіі дэзэртэры адціснуты урадавым войскам да Владаі. Сталіца у бясьпечнасьці.

ВЕНА. I.X. Міністар-прэзыдэнт Гусарэк выказаў у парлямэнце між іншым: „Палажэньне у Баўгарыі, праўда, паважнае, але не крытычнае. Аўторытэтныя колы кажуць, што ўсё зроблена, каб глядзець спакойна на далейшае разьвіцьце палажэньня".

кажа: «Водлуг Вашай просьбы Я аслабаняю Вас ад службовых абавязкаў. Я жадаю, каб народ у будучыне больш як дагэтуль меў вагу ў азначэнькі лёсу бацькаўшчыны. Мая воля, каб у будучыне мужы, што маюць веру ў народу, у вялікай меры ўчаствавалі ва ўрадзе. Для азначэньня Вам наступніка Я чакаю Вашага прадлажэньня».

БЭРЛІН. 30.IX. **Глаўная Камісія Рэйхстагу.** Замесьнік канцлера фон-Паер прачытаў імператарскі рэскрыпт пры крыках «браво» Ён дадаў ад сябе: «Мы яшчэ сёньня пачнём перагаворы з асобнымі прадстаўнікамі партыяў дзеля спаўненьня імператарскай волі“. Пасяджэньне глаўнай камісіі было посьля закрыта на неазначаны час.

БЭРЛІН. Дырэктары нацыянал-лібэральнай партыі ў Вэстфаліі пастанавілі дзеля цяперашняга палажэньня галасаваць за роўнае выбарнае права і ўвайсьці адразу ў змову аб гэтым з урадам.

БЭРЛІН. Консэрватыўная партыя Рэйхстагу выказала, што яна гатова стаць на плятформу Імпэратарскага рэскрыпту ад 30 верасьня дзеля канечнасьці злучыць усе сілы народу на пачэснае закончэньне вайны.

БЭРЛІН За апошнія дні тутака здарылася 7 выпадкаў азыяцкай халеры; з іх 6 сьмяротных. Прыняты патрэбныя асьцярожнасьці.

БЭРЛІН. 2.X. (В.Т.Б.). Імператар і Гіндэнбург прыехалі сёньня ў Бэрлін. Была парада на якой былі імпэратар, канцлер, Гіндэнбург, Макс Бадэнскі, Паер, Фрідберг і начальнік патайнае канцэлярыі Бэрг.

АМСТЭРДАМ (Рэўтэр). З газэтных вестак новае японскае міністэрства чыста партыйнае. Новы міністар-прэзыдэнт выказаў, што саюз з Англіей і ўмову з Амэрыкай ён лічыць найважнейшай рэчай японскай палітыкі.

ГЭЛЬСІНГФОРС. 30.IX. (В.Т.Б.). 27 жніўня чырвоныя гвардзісты напалі на дабравольцаў Усходняе Карэліі, 10 верасьня яны занялі Ухтуля і 19 верасьня атакавалі пры Кіроніемі, але былі адбіты. Яны носяць англіцкія формы і стаяць пад начальствам англіцкіх ахвіцэраў. Фінляндзкія правадыры Токой і Сіроля з некалькімі іншымі перайшлі на старану англійцаў.

ТЭЛЕГРАМЫ.

Нямецкія апавяшчэньні.

1.X. Заходні тэатр.

Фронт Рупрэхта Баварскага: Каля морскага берагу мы ўзялі пры ўдачным наступленьні некалькі сот бэльгійцаў у палон.

Наш новы фронт у Фляндрыі знаходзіцца на лініі Ітакрочнай фляндрскай бітвы.

Вораг атакаваў учора пасьля абеду паміж Роселяр і Вэрвік. Мы адбілі яго і ўзялі палонных бэльгійцаў, англічан і французаў. Наступленьне ворага паміж Флербэ і Гілюш было няўдачным З абодвух бакоў Камбрэ англійцы прадаўжалі свае заўзятыя атакі. Аднэй канадскай дывізыі ўдалося часова прасунуцца да Камійі. Контратакай нашай 26 дывізыі вораг быў адкінуты да Тільна. На поўдзень ад Камбрэ мы затрымалі так сама нашыя пазыцыі супроціў частых штурмаў ворага.

Фронт генэрал-ан шэфа ф. Бэн'а: З абодвух бакоў ад Ло-Шатло вораг прадаўжаў свае штурмы, якія усюды адбіты.

Фронт нямецкага Насьледніка: Супроць нашых новых ліній між Энь і Вэль і між Брой і Жоншры французы прадаўжалі свае заўзятыя штурмы. З выключэньнем аднэй вышыні на поўнач ад Брой вораг паўсюды быў адкінуты У Шампані пры Сэн Марі а Пі мы ўзялі дзьве роты палонных. К усходу ад Аргон амэрыканцы атакавалі з значнымі сіламі. Мы ўсюды адбілі ворага і ўсюды яму нарабілі шмат шкоды.

Фронт ф. Гальвіца: На заходнім беразі Маас без баёў.

2.X. Заходні тэатр.

У Фляндрыі з абодвух бакоў Камбрэ і Шампані мы адкінулі ярыя атакі ворага. На спакойных адрэзках фронту пры Сан Кантэн на паўночны заход ад Рэнс і на захад ад Аргон мы ўзялі часьці высунутых ліній назад.

Фронт Рупрэхта Баварскага: На поўнач ад Стадэн мы ўзялі каля сотні палонных. З абодвух старон дарог з Іпра на Розэляр і Мэнэн вораг дарма часта атакаваў. У Ледэгэм ён урваўся у нашыя лініі, але быў адкінуты. Пяты дзень бітвы пры Камбрэ скончыўся поўным разьбіцьцем ворага.

На поўнач ад Сан-Кур мы адбілі 8 разоў штурм ворага. Далей на поўдзень вораг часова прасунуўся ўперад, але контратакай мы адкінулі яго назад. Пры Камбрэ адбіты варожы штурм. Румыйі астаўся ў руках ворага.

Фронт генэрал ан-шэфа ф. Бэн'а: Паміж Лё-Катле і Уаз увесь дзень заўзятыя штурмы ворага, якія адбіты адчасьці нашымі контратакамі. Сан-Кантэн, дзе стаялі нашы разьведачныя аддзелы, разьбіты ворагам.

Фронт нямецкага Насьледніка: Стычкі паміж Айет і Энь. На паўночны заход ад Рэнс мы ўзялі сваё войска назад. У Шампані вораг прадаўжаў свае штурмы між Сэнт Марі а Пі і Монтуа, а таксама між Сомпю і Ор. Яго атакі адкінуты. Занятыя ў прошлай ночы новыя пазыцыі ідуць між Монтуа, Шарльранж, лес Анті, цераз Аргонскі лес да Апромон.

Фронт ф. Гальвіца: У мяйсцовых бітвах мы выкінулі амэрыканцаў з лесу Ожан і прылягаючых да яго ліній. Мы зьбілі ўчора 27 варажых самалётаў і 3 балёны на прывязі.

КАЛЯ ВАЙНЫ.

БЭРЛІН. 30.IX. На прыветную тэлеграму ад нямецкае партыі „Бацькаўшчына“ да Імператара прыйшоў адказ, ў якім між іншым кажацца: „Яго Вялічаства мае цьвёрдую надзею, што нямецкі народ ва ўсіх сваіх часьцёх будзе бараніць бацькаўшчыну да апошняга дыханьня. Тады з Божай помаччу ўдасца зламаць упорства ворага».

КЭЛЬН. 30.IX. Прадстаўнік работнікаў у прускай Палаце Паноў на адным сходзе сказаў: „У найбліжэйшыя дні будзе ведама, ці будзе Нямеччына ў будучыне раўнапраўная ў сьвеці, ці будзе змушана даставаць свае жыцьцёвыя патрэбы з Вашынгтону, Лёндону і Парыжу. Нам патрэбны ўрад нацыянальнай абароны. Нашы народ павінен еднацца ў гэтай думцы: „Нямеччына павінна жыць, хоць бы нам і прышлося памерці».

БУДАПЭШТ. 30.IX. Вэнгерскія газэты згодна заяўляюць аб цьвёрдым замераньні вэнгерскага народу застацца вернымі істнуючаму саюзу.

ВЕНА. 30.IX. (В.Т.Б). Урадова. Проста на захад ад возера Охрыда мы, лічачыся з палажэньнем на баўгарскім фронце, ачысьцілі пояс зямлі.

БЭРЛІН (В.Т.Б.). 30.IX. Навакол Англіі нашыя падводныя лодкі ізноў затапілі 15.000 тонн.

БЭРЛІН. 2.X. (В.Т.Б.). У блакадным поясе навакола Англіі мы затапілі 32.000 тонн, паміж іншым амерыканскі транспорт на 7.000 тонн.

КОНСТАНТЫНОПОЛЬ. Турэцкая міністэрская рада ў асобным паседжаньні займалася палітычным палажэньнем і пастанавіла безумоўна астацца вернай саюзу з цэнтральнымі дзяржавамі. Энвэр-паша сказаў, што навет пасьля выхаду Баўгарыі ён ня сумлевецца ва ўдачным канчатку вайны.

Друкавана у друкарні М. Кухты Выдавецтва «Гоман» Рэдактар Язэп Салавей.